Источник: "Літаратура і мастацтва" - 2013-12-20

# Цуд стварылі… злодзеі

Калі з Інстытута мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы НАН Беларусі ў Літаратурны музей М. Багдановіча была перададзена частка архіва Адама Ягоравіча Багдановіча, бацькі паэта, для навуковых супрацоўнікаў, якія даследавалі матэрыялы архіва, пачалі адкрывацца новыя таямніцы, звязаныя з сям'ёй Багдановічаў.

Так, падчас экскурсіі на асноўнай экспазіцыі Літаратурнага музея М. Багдановіча ўвага наведвальніка звычайна звяртаецца на літаграфію вядомай карціны Рафаэля Санці «Мадонна з дзіцем», якая належала сям'і Багдановічаў. Пра музейны прадмет вядомая наступная легенда.

Гэтую гравюру Адаму Багдановічу калісьці падарыў Максім Горкі: у той час Адам Ягоравіч быў жанаты з сястрой жонкі вядомага рускага пісьменніка Аляксандрай Волжынай. Паводле ўспамінаў Дзіядора Дзябольскага, сябра Максіма Багдановіча, сюжэты твораў сусветнага мастацтва, а дакладней, закранутыя ў іх філасофскія тэмы, адлюстроўваліся ў творах Максіма. Да прыкладу, сюжэт графічнай работы «Хрыстос, які пастукаўся» (яна таксама захоўвалася ў доме Багдановічаў) натхніў на напісанне апавяданняў «Музыка», «Апокрыф», «Апавяданне аб іконніку і залатару». Геліягравюра карціны Рафаэля «Мадонна з дзіцем», якая вісела ў кабінеце бацькі над пісьмовым сталом, наводзіла паэта на філасофскае асэнсаванне ролі жанчыны ў жыцці.

У 1918 годзе падчас белагвардзейскага мяцяжу ў Яраслаўлі дом Багдановічаў разам з усёй маёмасцю быў знішчаны пажарам. Адам Ягоравіч у гэты час знаходзіўся за горадам — там было больш спакойна. Калі ён вярнуўся на папялішча свайго дома, то знайшоў не кранутую агнём папяровую геліягравюру «Мадонна з дзіцем».

Адам Багдановіч з павагай ставіўся да ўсяго, што выходзіла з-пад пяра, таму на працягу жыцця збіраў і захоўваў перапіску. У яго архіве знойдзены дублікат заявы ў паліцэйскае ўпраўленне, дзе Адам Ягоравіч паведамляе, што пасля таго, як ён выехаў за горад (са слоў сведак), кватэра Багдановічаў была разрабавана: суседзі бачылі, як марадзёры вывозілі маёмасць падводамі. Адам Ягоравіч склаў спіс прадметаў, што зніклі і пасля выпадкова знаходзіліся ў розных мясцінах горада. Тады ён выказаў меркаванне, што спачатку злодзеі сярод іншай маёмасці забралі і геліягравюру «Мадонна з дзіцем», але, не знайшоўшы ў ёй каштоўнасці, проста выкінулі на папялішча.

Так праз рукі злодзеяў, якія зберaглі геліягравюру ад агню, адбыўся цуд. З тых часоў падарунак Максіма Горкага з асаблівым трапятаннем захоўвалі ў сям'і Багдановічаў, а пасля стварэння Літаратурнага музея Максіма Багдановіча «Мадонна з дзіцем» трапіла ў фонды і стала адным з самых каштоўных экспанатаў.

**Людміла САСОНКА**

Людміла Сасонка. Цуд стварылі… злодзеі